**Т. А. Навагродскі**

Кафедра этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў, гістарычны факультэт, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск, Беларусь

УДК 39(476)(092)+39(=161.3)

# УКЛАД Л. В. РАКАВАЙ У ВЫВУЧЭННЕ ЭТНАГРАФІЧНАЙ СПАДЧЫНЫ БЕЛАРУСАЎ

Артыкул прысвечаны ўкладу Л. В. Ракавай у вывучэнне этнаграфічнай спадчыны беларусаў.

**Ключавыя словы:** жанчыны-вучоныя, этналогія, беларусы.

**Узор цытавання:** *Навагродскі Т. А.* Уклад Л. В. Ракавай у вывучэнне этнаграфічнай спадчыны беларусаў // София: электрон. науч.-просветит. журн. 2019. № 2. С. 8–10.

**T. Novogrodsky**

Department of ethnology, museology and history of arts, faculty of history, Belarusian State University, Minsk, Belarus

# THE CONTRIBUTION OF LUBOV RAKOVA TO THE STUDY OF ETHNOGRAPHIC HERITAGE OF BELARUSIANS



The article is devoted to the contribution of Lubov Rakova to the study of ethnographic heritage of belarusians.

**Keywords:** women-scientists, ethnology, Belarusians.

**For citation:** Novogrodsky, T. (2019). The contribution of Lubov Rakova to the study of ethnographic heritage of Belarusians. *Sophia*, 2, 8–10 (in Belar.).

**Аўтар:**

**Тадэвуш Антонавіч Навагродскі** – доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў гістарычнага факультэта БДУ.

*tadeush_minsk@mail.ru*

**Author:**

**Tadeush Novogrodsky** – doctor of history, professor, head of the department of ethnology, museology and history of arts of the faculty of history, BSU.

15 красавіка свой высокі юбілей адзначыла Любоў Васільеўна Ракава, доктар гістарычных навук, вядучы навуковы супрацоўнік аддзела нарадазнаўства Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Нарадзілася яна 15 красавіка 1949 года ў вёсцы Сушчэўская Слабодка Чавускага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і. Пасля заканчэння сярэдняй школы ў Чавусах, паступіла на гістарычны факультэт Магілёўскага педагагічнага інстытута, які скончыла ў 1972 годзе. З 1968 года свой лёс Л. В. Ракава звязала з Нацыянальнай акадэміяй навук, дзе спачатку працавала сакратаром-машыністкай Лабараторыі геахімічных праблем (1968–1970), а з 1970 года перайшла на працу ў Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі.

Вось ужо амаль 50 год жыццё Любові Васільеўны непарыўна звязана з гэтым інстытутам, дзе яна прайшла шлях ад старшага лабаранта да вядучага навуковага супрацоўніка аддзела нарадазнаўства. Пасля заканчэння аспірантуры ў 1983 годзе



Л. Ракава паспяхова абараніла кандыдацкую дысертацыю «Быт і культура працоўнай моладзі горада (па матэрыялах этнасацыялагічных даследаванняў)» па спецыяльнасці этнаграфія, а ў 2010 годзе пасля вучобы ў дактарантуры – доктарскую дысертацыю «Эвалюцыя традыцый сямейнага выхавання беларусаў у XIX–XX стст.».

Ракава Любоў Васільеўна – адзін з вядучых спецыялістаў у галіне беларускай этналогіі, аўтар звыш 120 навуковых прац. Сярод іх 4 асабістыя аўтарскія манаграфіі: «Быт и культура городской молодежи» – Минск: Наука и техника, 1989. – 127 с.; «Традыцыі сямейнага выхавання ў беларускай вёсцы» – Мінск: Ураджай, 2000; «Гісторыя на градках: агародніцтва на Беларусі» – Мінск: Беларусь, 2008. – 144 с.; «Эвалюцыя традыцый сямейнага выхавання беларусаў у XIX–XX стст.» – Мінск: Навуковая думка, 2009. – 111 с. Л. Ракавай напісаны 3 манаграфіі ў сааўтарстве з В. Бялявінай, а таксама асобныя раздзелы ў 28 калектыўных манаграфіях і шматлікія артыкулы ў розных зборніках навуковых прац.

Даследчыца актыўна ўдзельнічае ў напісанні серыі «Этнакультурныя працэсы…» па ўсіх 6 рэгіёнах нашай краіны. Зараз у выдавецтве «Беларуская навука» рыхтуецца здача 5-га тома, прысвечанага Заходняму Палессю, дзе Л. Ракавай напісаны два раздзела: па касцюму і па традыцыях выхавання дзяцей у гэтым вельмі цікавым з пункту гледжання этналогіі рэгіёне, выданне якога плануецца ў 2019 годзе.

У сааўтарстве з В. М. Бялявінай Л. В. Ракавай напісаны 3 кнігі: «Мужчынскі касцюм на Беларусі» – Мінск: Беларусь, 2007 і «Жаночы касцюм на Беларусі» – Мінск: Беларусь, 2007. – 351 с.

Пастановай Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі № 54 ад 6 снежня 2007 года кніга «Мужчынскі касцюм на Беларусі» атрымала дыплом лаўрэата прэміі НАН Беларусі і прысуджана прэмія. Работы «Мужчынскі касцюм на Беларусі» і «Жаночы касцюм на Беларусі» атрымалі ў 2007 годзе дыпломы 3-й ступені ў Маскве і 1-й ступені ў Мінску і ў Кіеве. Гэтым працам Міністэрствам інфармацыі прысвоены «Золотой фолиант» і выданы дыплом пераможца Нацыянальнага конкурса «Мастацтва кнігі – 2008» у намінацыі «Лучшее научное издание 2008 года».

Сумесная праца з В. Бялявинай «Беларускі касцюм» Мінск: Беларусь, 2017–463 с. іл. атрымала ў 2018 годзе дыпломы 1-й ступені на чатырох міжнародных кніжных выставах у Мінску, Маскве, Ашхабадзе і Душанбэ ў намінацыі «Мая краіна».

Сфера інтарэсаў Л. Ракавай ахоплівае гістарычную эвалюцыю духоўнай і матэрыяльнай культуры беларусаў: святы і абрады, традыцыі агародніцтва на беларускіх землях. Важнае месца ў даследаваннях аўтара ўдзелена праблемам развіцця сям'і і сямейна-шлюбных адносін, традыцый сямейнага выхавання беларусаў у XIX–XX стст., дзяржаўных свят і абрадаў, этнакультурнага ўзаемадзеяння этнасаў у касцюме на сучасным этапе і накіравана на захаванне і папулярызацыю базавых каштоўнасцей беларускай культуры.

Л. В. Ракава з'яўляецца лаўрэатам прэміі «За духоўнае адраджэнне» (2008.) за 10-томнае выданне «Беларусы», лаўрэатам прэміі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (2007).

Работы аўтара прайшлі апрабацыю на рэспубліканскіх і міжнародных канферэнцыях, выкарыстаны пры рэалізацыі Прэзідэнцкай праграмы «Дети Беларуси», ГКПНИ «История и культура», ляглі ў аснову распрацоўкі агульных і спецыяльных курсаў для студэнтаў БДУ, Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта ім. Ф. Скарыны, Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, Інстытута сучасных ведаў імя Шырокава і інш.

Л. Ракава ўнесла значны ўклад у айчынную і славянскую этналогію, распрацоўку тэарэтычных асноў нацыянальнай культуры сямейнага выхавання беларусаў, адкрыццё новых фактаў і заканамернасцей іх эвалюцыі, падрыхтоўку першага комплекснага даследавання традыцый агароднiцтва на беларускіх землях XVI–XX стст., распрацоўку прынцыпова новага падыходу ў эвалюцыі касцюма, які атрымаў прызнанне ў краіне і за яе межамі і г. д. Ёй падрыхтаваны 2 аспіранткі.

Штогод Любоў Васільеўна прымае актыўны ўдзел у рабоце этнаграфічных экспедыцый. За многія гады працы яна аб’ездзіла амаль усю тэрыторыю Беларусі, сабрала багацейшы палявы этнаграфічны матэрыял па многіх частках традыцыйнай беларускай культуры. Працаваць з ёю у этнаграфічнай экспедыцыі – адно задавальненне. Яна дасканала валодае ўсімі спосабамі і прыёмамі палявой работы, па-майстэрску ўмее выбраць патрэбнага па дадзенай тэме інфарманта, правільна яго апытаць і сваім вопытам этнолаг шчодра дзеліцца з пачынаючымі даследчыкамі. Працуючы ў шматлікіх экспедыцыях, Любові Васільеўне ўдалося сабраць багацейшы палявы этнаграфічны матэрыял, які паслужыў падмуркам для многіх грунтоўных навуковых прац, напісаных даследчыцай.

7 гадоў Любоў Васільеўна ўзначальвала прафсаюзную арганізацыю інстытута. Сярод калег інстытута Л. В. Ракава карыстаецца павагай і заслужаным аўтарытэтам.

Свой юбілей Л. В. Ракава сустракае ў росквіце творчага таленту, поўная цікавых ідэй і задум. Віншуем Вас з юбілеем, жадаем творчага плёну ў працы, бясконцага навуковага пошуку і каб ваша шчырая ўсмешка як мага даўжэй сагравала нас сваім цяплом.

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 14.08.2019.*